# ЗНІШЧАЙЦЕ ФАШЫСЦКІХ ПАГАНЦАЎ!

## (Прамова Старшыні Савета Народных Камісараў БССР І. С. БЫЛІНСКАГА)

Дарагія таварышы, браты і сёстры, сыны і дочкі, людзі роднай Беларусі!

Вось ужо больш шасці месяцаў азвярэлыя нямецкія банды топчуць нашу родную зямлю. На ўсёй Беларусі чуюцца стогны замучаных людзей. Над беларускімі лясамі, палямі і азёрамі, над спаленымі вёскамі і зруйнаванымі гарадамі вісіць няшчасце і гора. Там, дзе стаялі калгасныя сёлы, дзе цвілі сады, дзе радаваўся жыццю чалавек — вецер узнімае хмары халоднага попелу. Шыбеніцы, расстрэлы, грабяжы, гвалтаванне жанчын — вось што прынеслі нямецкія акупанты беларускаму народу.

Вялікая нянавісць да нямецкіх звяроў, гнеў і помста аб'ядналі ў адну сям'ю з усімі народамі наш гераічны беларускі народ. Ніколі, ніякім захопнікам не пакараўся і не пакарыцца наш родны, свабодалюбівы беларускі народ.

Бязлітаснымі і суровымі вачыма глядзіць народная помста ў твар нямецкім бандытам. Ніводзін з іх не міне і нідзе не схаваецца ад яе. Беларускі народ паклаўся свайму роднаму бацьку — вялікаму СТАЛІНУ, што яго наказ — знішчыць усіх немцаў да адзінага, якія прабраліся

атрыманую з рук партыі Леніна-Сталіна, руйнуюць створаныя нашай працай фабрыкі і заводы. Гітлераўскія малойчыкі знішчаюць нашу культуру. Яны паляць творы нашых народных паэтаў, паляць кнігі на беларускай мове, знішчаюць бібліятэкі, закрылі беларускія школы. Фашысты імкнуцца аняменчыць беларускі народ, які вякамі рука аб руку з вялікім рускім народам вёў барацьбу за сваё нацыянальнае і сацыяльнае вызваленне. Нямецкія фашысты нясуць для беларускага народа памешчыцкі бізун і нагайку, ланцугі і кайданы.

Але гэтаму не бываць ніколі! Беларускі народ напоўнен жорсткай нянавісцю да ворага. Кожны дом, куст, дрэва хаваюць у сабе смерць для абнаглеўшай банды. Замест беларускай зямлі і леса прускія бароны і нямецкія бароны атрымоўваюць смерць. Замест хлеба і сала — дубовы кол у азвярэлае горла.

Працоўныя роднай Беларусі! Усе, хто здолен насіць зброю, уступайце ў партызанскія атрады, не давайце ворагу спакою, узрывайце масты, склады, знішчайце сувязь, падпальвайце харчовыя склады і базы з гаручым, нападайце на аба-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаеміцца у бібліятэцы